Дзяржаўная ўстанова адукацыі

“Сярэдняя школа №15 г. Мазыра імя генерала Барадунова Я.С.”

# АПІСАННЕ ВОПЫТУ ПЕДАГАГІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ “ФАРМІРАВАННЕ ЧЫТАЦКАЙ АДУКАВАНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ СРОДКАМІ ПРАКТЫКА-АРЫЕНТАВАНЫХ ЗАДАННЯЎ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ НА ДРУГОЙ СТУПЕНІ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ”

Саўчыц Ганна Васільеўна

настаўнік беларускай мовы і літаратуры

8(029)839-72-78

e-mail: sava.anna1@mail.ru

# 1. Інфармацыйны блок

## 1.1. Назва тэмы вопыту

Фарміраванне чытацкай адукаванасці навучэнцаў сродкамі практыка-арыентаваных заданняў на ўроках беларускай мовы на другой ступені агульнай сярэдняй адукацыі

**1.2.** Актуальнасць вопыту

У Беларусі назіраецца тэндэнцыя да зніжэння цікавасці да чытання, асабліва сярод моладзі. Гэта звязана з развіццём лічбавых тэхналогій, змяненнем вольнага часу і іншымі фактарамі. У эпоху багацця інфармацыі з розных крыніц (інтэрнэт, СМІ, сацыяльныя сеткі) важна ўмець адрозніваць факты ад меркаванняў, ацэньваць дакладнасць дадзеных, аналізаваць аргументы. Чытацкая адукаванасць развівае навыкі крытычнага мыслення, неабходныя для навігацыі ў інфармацыйнай прасторы.

Чытацкая адукаванасць – базавы кампанент функцыянальнай пісьменнасці, якая дазваляе чалавеку выкарыстоўваць веды для вырашэння жыццёвых задач, адаптацыі ў грамадстве і самаразвіцця, што знаходзіць адлюстраванне ў Адукацыйным стандарце Рэспублікі Беларусь. Згодна з гэтым дакументам, навучэнцы павінны ўмець разумець і аналізаваць інфармацыю, прадстаўленую ў выглядзе тэксту, малюнка, схемы, табліцы; умець прымяняць атрыманыя веды для тлумачэння з'яў навакольнага свету і вырашэння разнастайных праблем у розных жыццёвых кантэкстах: адукацыі, прафесійнай дзейнасці, зносінах, у працэсе самастойнай дзейнасці. [1]

Чытацкая адукаванасць разглядаецца як аснова для паспяховага засваення іншых прадметаў і далейшай адукацыі. Паводле нацыянальнага даследавання якасці адукацыі (НДЯА), пры фарміраванні чытацкай адукаванасці варта звярнуць увагу на: разуменне мэты работы з тэкстам, фарміраванне навыкаў асэнсаванага чытання, навучанне стратэгіі работы з тэкстам, выкарыстанне ў працэсе тэкстаў, якія маюць комплексны кантэнт і розную форму падачы інфармацыі (карты, графікі, дыяграмы, спасылкі і інш.) [3, с. 10].

Але з другога боку працэс навучання – гэта не проста запамінанне тэксту, або яго разуменне, а выкарыстанне набытых ведаў у рэальных жыццёвых сітуацыях. Пагэтаму пры фарміраванні чытацкай адукаванасці важна выкарыстоўваць такія віды заданняў, якія дазволяць правільна ацэньваць змены ў навакольным свеце і прымяняць веды на практыцы.

У сваёй працы я сутыкнулася з супярэчнасцямі: з аднаго боку, вучні не любяць чытаць і ўнікаць у прачытанае, з другога боку, вучань павінен авалодаць наборам кампетэнцый, а значыць умець працаваць з інфармацыяй (тэкстам).

Для выяўлення сфарміраванасці чытацкай адукаванасці вучняў у 5 “Г” класе правяла анкетаванне, якое выявіла наступныя праблемы: з 30 анкетаваных вучняў на высокім узроўні справіліся з заданнем на засваенне зместу тэксту 12 вучняў (40%), на добрым узроўні – 7 вучняў (23%), на задавальняльным – 6 (20%) вучняў, на нізкім узроўні выканання задання – 5 вучняў, што склала 16%. Усё гэта дазволіла мне сфармуляваць мэту вопыту.

### 1.3. Мэта вопыту

Выкарыстанне практыка-арыентаваных заданняў на ўроках беларускай мовы будзе садзейнічаць фарміраванню чытацкай адукаванасці навучэнцаў на другой ступені агульнай сярэдняй адукацыі

### 1.4. Задачы вопыту

Падабраць комплекс практыка-арыентаваных заданняў, накіраванах на фарміраванне чытацкай адукаванасці вучняў на ўроках беларускай мовы ў 5-9 класах.

Апрабіраваць на ўроках беларускай мовы падабраны комплекс і распрацаваныя самастойна практыка-арыентаваныя заданні на фарміраванне чытацкай адукаванасці вучняў.

Прааналізаваць эфектыўнасць практыка-арыентаваных заданняў і іх уплыў на фарміраванне чытацкай адукаванасці.

### 1.5. Працягласць працы над вопытам

Праца над вопытам пачалася ў 2021 – 2022 навучальным годзе і працягваецца дагэтуль.

## 2. Апісанне тэхналгій вопыту

**2.1. Вядучая ідэя вопыту.**

Выкарыстанне практыка-арыентаваных заданняў на ўроках беларускай мовы будзе садзейнічаць фарміраванню чытацкай адукаванасці вучняў на другой ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

**2.2.** Апісанне сутнасці вопыту

Чытацкая адукаванасць з'яўляецца першараднай у працы з інфармацыяй. Школьнік, які адчувае праблемы ў разуменні тэкстаў, непазбежна будзе сутыкацца са складанасцямі ў навучанні, бо тэкст у вуснай або пісьмовай форме ляжыць у аснове любой задачы. Таму важна навучыць успрымаць і аналізаваць дадзеныя, прадстаўленыя ў розных крыніцах, разумець графікі і дыяграмы, відэаматэрыялы і малюнкі, коміксы і фатаграфіі.

Даследчыкі Лебедзеў А.Е., Хутарскі А.В. сыходзяцца ў меркаванні, што менавіта чытацкая адукаванасць з'яўляецца перадумовай авалодання неабходнымі кампетэнцыямі і ўмовай дасягнення кампетэнтнасці. [4]

В. Ф. Русецкі, В. У. Зелянко фармулююць задачу фарміравання чытацкай адукаванасці з пазіцыі прыярытэтаў дзяржаўнай адукацыйнай палітыкі ў Беларусі. Вучоныя акрэсліваюць круг кампетэнцый для сучаснага выпускніка: здольнасць комплексна вырашаць праблемы, каардынаваць свае дзеянні з іншымі людзьмі, узаемадзейнічаць з імі, фармуляваць уласныя разважанні, прымаць на іх аснове рашэнні; валодаць крытычным мысленнем, крэатыўнасцю, эмацыянальным інтэлектам. Пад чытацкай адукаванасцю даследчыкі разумеюць найперш “здольнасць і гатоўнасць да прымянення ў разнастайных жыццёвых сітуацыях атрыманых ведаў і сфарміраваных уменняў”. [3,12]

Пад практыка-арыентаванымі разумеюць такія заданні, сюжэт для якіх узяты з паўсядзённай рэчаіснасці, а іх рашэнне неабходна для выкарыстання ў жыццёвых сітуацыях. Сістэматычнае прымяненне такіх заданняў на ўроках

беларускай мовы садзейнічае павышэнню ў дзяцей матывацыі да вывучэння прадмета і паспяховай сацыялізацыі. Мною былі падабраны, распрацаваны і сістэматызаваны практыка-арыентаваныя заданні для фарміравання чытацкай адукаванасці вучняў, якія змешчаны ў табліцы.

| Этап урока | Клас | Віды заданняў | Вынік дзейнасці |
|---|---|---|---|
| Матывацыйна-арганізацыйны | 6 | "Чацвёрты лішні" | Навык хуткага аналізу моўных з'яў; здольнасць выкарыстання тэрміналогіі ў камунікатыўнай сітуацыі. |
| | 7 | "Параўнальны аналіз" | Навык аналізу тэксту па пэўных крытэрыях; уменне вылучаць патрэбную інфармацыю. |
| | 8 | "Тэкст з белымі плямамі" | Разуменне структуры і зместу тэксту; навык хуткага аналізу інфармацыі. |
| | 9 | "Міф ці праўда" | Навык адрознення навуковых фактаў ад памылковых выказванняў. |
| Пазнавальна-аперацыйны | 5 | "Рэцэпт" | Навык чытання і аналізу інструктыўнага тэксту; уменне апісваць працэс і вынік сваёй працы ў пісьмовай і вуснай форме; вылучэнне структуры тэксту; развіццё творчага падыходу да звычайных задач. |
| | 6 | "Слухаем і адказваем" | Уменне адбіраць інфармацыю з праслуханага матэрыялу. |
| | 7 | "Ствары і запішы" | Уменне ствараць тэксты розных стыляў. |
| | 8 | "Рэканструкцыя сказаў" | Навык узнаўлення і апрацоўкі сказаў з улікам граматычных, арфаграфічных, пунктуацыйных і стылістычных норм. |
| | 9 | "Падказка з канверта" | Вопыт публічнага выступлення; уменне аргументавана даносіць думку да аўдыторыі; развіццё навыкаў працы з рознымі тыпамі |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | | тэкстаў і інфармацыі; уменне самастойна вырашаць задачы з дапамогай падказак. |
| Дыягнастычна-карэкцыйны | 5 | “Параўнай і знайдзі” | Уменне фармуляваць тэму, асноўную думку; вызначаць крытэрыі для стылю маўлення. |
| | 6 | “Рэпартаж з мепапрыемства” | Навык стварэння ўласнага тэксту пэўнага жанру; уменне лаканічна будаваць выказванне. |
| | 7 | “Лаві памылку” | Навык хуткага знаходжання і карэктыроўкі інфармацыі. |
| | 8 | “Цікаўны тэкст” | Уменне аналізаваць тэкст; навык вылучэння галоўнай інфармацыі, уменне самастойнай працы з тэкстам. |
| | 9 | “Дэбаты” | Навык правільнага, лагічнга доказу думкі, развіццё вуснага маўлення. |
| Завяршальны | 5 | “Слоўнік турыста” | Навык аналізу інфармацыі; праверка інфармацыі на правільнасць; папаўненне ўласнага слоўнікавага запасу. |
| | 6 | “Рэкламны буклет” | Пошук і адбор дакладнай інфармацыі; аналіз і сістэматызацыя звестак; здольнасць перадаваць складаную інфармацыю ў простай і зразумелай форме. |
| | 7 | “Складанне інструкцыі” | Навык дакладна фармуляваць выказванне, лагічна перадаваць інфармацыю. |
| | 8 | “Рэклама” | Вопыт стварэння рэкламных тэкстаў, выкарыстанне тэкстаў у рэальных сітуацыях. |
| | 9 | “Дыялог двух чытачоў” | Навык сістэматызацыі інфармацыі; уменне асэнсавана даваць адказ на аснове прачытанага тэксту. |

На пазнавальна-аперацыйным этапе ў 5 класе выкарыстоўваю заданне “Рэцэпт” пры вывучэнні тэмы “Лексічнае значэнне слова”. Абмяркоўваю з вучням пытанні: дзе мы сустракаем рэцэпты ў жыцці; з якіх частак складаецца рэцэпт; якія моўныя асаблівасці ёсць у тэкстах кулінарнай тэматыкі? Знаёмлю з паняццямі: інгрэдыенты, порцыя, прысмакі, грамоўка, патрабуецца, дадаць і г.д. Вучні працуюць з тэкстамі (рэцэптамі):1 група – складае спіс інгрэдыентаў для рэцэпту па ўзоры); 2 група – пераўтварае спіс інгрэдыентаў у звязанае выказванне; 3 група – складае свой рэцэпт. Пры дапамозе такога задання ў вучняў фарміруецца навык чытання і аналізу інструктыўнага тэксту, уменне вылучаць яго структуру, здольнасць апісваць працэс і вынік сваёй працы.

На дыягнастычна-карэкцыйным этапе пры вывучэнні тэмы “Мастацкі, гутарковы і навуковы стылі маўлення” ў 5 класе прапаную вучням заданне “Параўнай і знайдзі”, у якім неабходна запоўніць таблічку з крытэрыямі.

| Крытэрыі | Тэкст 1 | Тэкст 2 |
|---|---|---|
| Тэма тэкста | | |
| Асноўная думка | | |
| З якой мэтай выкарыстоўваецца | | |
| Дзе выкарыстоўваецца | | |
| Моўныя сродкі | | |
| Стыль | | |

Такое заданне дапамагае вучням атрымаць навык удумлівага чытання і разумення тэкстаў розных стыляў, параўноўваць тэксты, размяжоўваць і запамінаць асаблівасці кожнага са стыляў.

На завяршальным этапе ў якасці дамашняга задання прапаную вучням скласці “Слоўнік турыста” пры вывучэнні тэмы “Запазычаныя словы ў беларускай мове” ў 5 класе. Вучням неабходна зрабіць міні-слоўнік, які зможа выкарыстаць іншаземец. Словы неабходна разбіць на тэматычныя групы (ветлівасць, транспарт, ежа, славутасці і г.д.). Такое заданне даю як індывідуальна, так і ў парах. Вучні аналізуюць, шукаюць і правяраюць інфармацыю, сістэматызуюць уласны слоўнікавы запас.

На матывацыйна-аперацыйным этапе, пачынаючы з 6 класа, прапаную вучням заданне “Чацвёрты лішні” пры вывучэнні тэмы “Простыя, складаныя і састаўныя колькасныя лічэбнікі, іх скланенне, ужыванне і правапіс”. З чатырох груп слоў (паняццяў) неабходна знайсці «лішні» элемент у кожнай групе і патлумачыць свой выбар. Гэта дапамагае вучню вылучаць агульныя і розныя рысы ў групах, класіфікаваць словы па пэўных крытэрыях і рабіць высновы.

На пазнавальна-аперацыйным этапе выкарыстоўваю заданне “Слухаем і адказваем” пры вывучэнні тэмы “Назоўнікі канкрэтныя і абстрактныя”. Вучні слухаюць кароткі гуказапіс па тэме “Купалле”. Пасля першага праслухоўвання прашу запісаць галоўную думку тэксту, пасля паўторнага – адказаць на пытанні па змесце (пытанні могуць быць як «тонкія», так і «тоўстыя»). Гэта дазваляе развіваць успрыманне маўлення на слых, вылучаць ключавую інфармацыю з вуснага тэксту.

На дыягнастычна-карэкцыйным этапе прапаную заданне “Рэпартаж з мерапрыемства” пры вывучэнні тэмы “Род назоўнікаў. Несупадзенне роду некаторых назоўнікаў у беларускай і рускай мовах”. Шасцікласнікам трэба ўявіць сябе карэспандэнтамі, напісаць кароткі рэпартаж пра школьнае свята. Далей працую з гатовым тэкстам, вучні падкрэсліваюь іх і вызначаюць род і склон. Такія заданні спрыяюць не толькі развіццю маўлення, але і замацаванню ведаў па тэме, і пашырэнню лексічнага запасу.

На завяршальным этапе даю заданне “Рэкламны буклет” пасля вывучэння тэмы “Якасныя, адносныя і прыналежныя прыметнікі, іх роля ў маўленні” ў 6 класе. Вучні выбіраюць адзін з турыстычных маршрутаў па Беларусі, знаходзяць цікавыя факты, ствараюць уласныя буклеты. Вучні працуюць у парах, вучацца перадаваць складаную інфармацыю ў простай і зразумелай форме, знаёмяцца з асновамі рэкламы і маркетынгу.

У 7 класе для паўтарэння вывучанага матэрыялу па тэме “Тэкст і яго асноўныя прыметы. Спосабы і сродкі сувязі сказаў і частак тэксту” на матывацыйна-аперацыйным этапе даю вучням заданне “Параўнальны аналіз”. Вучні чытаюць тэксты і запаўняюць табліцу адрозненняў.

| Параметры параўнання | Мастацкі тэкст | Навуковы тэкст |
|---|---|---|
| Мэта стварэння | | |
| Асаблівасці стылю | | |
| Структура | | |
| Уздзеянне на чытача | | |

Такое заданне выпрацоўвае ў вучняў уменне вылучаць і параўноўваць асаблівасці тэкстаў розных стыляў.

На пазнавальна-аперацыйным этапе ў 7 класе даю вучням заданне "Ствары і запішы" пры вывучэнні тэмы "Паглыбленне паняцця пра стылі маўлення" ў выглядзе напісання ліста сябру, стварэння аб'явы. Такое заданне актывізуе лексіку, вучыць выразна і дакладна выказваць думкі, будаваць лагічныя, выразныя тэксты.

На завяршальным этапе прапаную вучням заданне "Складанне інструкцыі" для замацавання ведаў па тэме "Лады дзеяслова" ў 7 класе. Вучні складаюць інструкцыю, ужываючы дзеясловы загаднага ладу. Такое заданне дапамагае засвоіць тэарэтычны матэрыял, фарміруе навык лагічна і паслядоўна перадаваць інфармацыю.

На дыягнастычна-карэкцыйным этапе прапаную вучням заданне "Лаві памылку". Вучням прапануецца тэкст з наўмысна дапушчанымі памылкамі. Задача – знайсці і выправіць іх. Такое заданне развівае ўважлівасць і назіральнасць, фарміруе навык самакантролю.

Пачынаючы з 8 класа, на пазнавальна-аперацыйным этапе пры вывучэнні тэмы "Парадак слоў у сказе. Лагічны націск" даю заданне "Рэканструкцыя сказаў". Вучням неабходна перабудаваць сказы, выкарыстаўшы словы ў дужках. Заданне развівае навык складання разнастайных сінтаксічных канструкцый.

На завяршальным этапе пры вывучэнні тэмы "Зваротак. Неразвітыя і развітыя звароткі, іх выдзяленне ў вусным і пісьмовым маўленні" ў 8 класе прапаную заданне "Цікаўны тэкст". Вучні чытаюць тэкст, вызначаюць асноўную ідэю, галоўныя факты. Пры дапамозе такіх заданняў вучні развіваюць

уменне аналізаваць інфармацыю, вылучаць галоўнае і другараднае, удасканальваюць навыкі самастойнай працы з тэкстам.

На матывацыйна-аперацыйным этапе ўрока пры вывучэнні тэмы “Паняцце пра складаназалежны сказ” у 9 класе даю заданне “Міф ці праўда”, дзе вучням неабходна вызначыць: з’яўляецца выказванне міфам або праўдай. Такія заданні развіваюць крытычнае мысленне, навыкі аналізу і праверкі інфармацыі, вучаць адрозніваць навуковыя факты ад памылковых уяўленняў.

На пазнавальна-аперацыйным этапе пры вывучэнні тэмы “Сінтаксіс як раздзел граматыкі, яго асноўныя адзінкі і іх характарыстыка” даю вучням заданне “Падказка з канверта”. Вучні дзеляцца на групы, атрымліваюць канверт з падказкамі, далей вырашаюць практычную задачу – ствараюць тэкст па тэме. Кожны канверт змяшчае: задачу (што трэба зрабіць), інфармацыйныя матэрыялы (тэксты, урыўкі, артыкулы, лісты), візуальныя элементы (фотаздымкі, ілюстрацыі, схемы, карты), патрабаванні да выніку – тэкст, прэзентацыя, буклет, інструкцыя і г.д.

На дыягнастычна-карэкцыйным этапе ў 9 класе пры вывучэнні тэмы “Знакі прыпынку паміж часткамі ў бяззлучнікавым сказе” даю заданне “Дэбаты”, у якасці тэмы прапаную “Беларуская мова ў школе”. Клас дзялю на дзве групы: першая выступае за пашырэнне выкладання беларускай мовы ў школах, другая выступае за больш шырокае выкарыстанне рускай мовы ў адукацыйным працэсе. Кожная група рыхтуе аргументы ў падтрымку сваёй пазіцыі, пасля ідуць дэбаты. Такія заданні дапамагаюць выбіраць і фармуляваць аргументы, павагу да розных меркаванняў і адстойваць уласную пазіцыю.

## 2.3. Рэзультатыўнасць і эфектыўнасць вопыту.

У якасці метадаў ацэнкі майго педагагічнага вопыту я звярнулася да тэсту на ацэнку сфарміраванасці чытацкай адукаванасці Л.А. Ясюковай, які прымяняла з 5 па 9 класы. Паказчыкам рэзультатыўнасці вопыту з’яўляецца павышэнне ўзроўню сфарміраванасці асэнсаванай чытацкай дзейнасці вучняў.

Анкетаванне, якое праводзілася ў 5, 7, 9 класах, дазволіла атрымаць поўную карціну развіцця навыкаў працы з тэкстам у вучняў. Пры выкарыстанні практыка-арыентаваных заданняў назіраецца паспяховая дынаміка. Так, у 9 класе на нізкім узроўні застаўся толькі адзін вучань, на задавальняльным – 5 вучняў, што складае 16 %, а на высокім узроўні – 15 вучняў, што складае 50 %. Эфектыўнасць выкарыстання практыка-арыентаваных заданняў пацвярджаецца стабільным і паспяховым ростам вынікаў.

## Заключэнне

Аналізуючы свой вопыт, магу смела сказаць, што выкарыстанне практыка-арыентаваных заданняў на ўроках беларускай мовы садзейнічае фарміраванню асэнсаванага чытача, а таксама развівае чытацкую адукаванасць, якая ў сваю чаргу будзе садзейнічаць фарміраванню навыка чытання і аналізу тэксту, умення апісваць працэс і вынік сваёй працы ў пісьмовай і вуснай форме, праверкі інфармацыі на правільнасць, развіццю творчага падыходу да звычайных задач. Паколькі чытацкая адукаванасць фарміруецца на любым уроку, апісаныя мною заданні могуць быць выкарыстаны ў межах любых заняткаў, на якіх тэкст выступае крыніцай інфармацыі.

Тэму вопыту педагагічнай дзейнасці лічу перспектыўнай, пагэтаму праца над ім будзе мною працягвацца. Матэрыялы вопыту былі выкарыстаны на пасяджэнні школьнага вучэбна-метадычнага аб’яднання настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры, на педагагічным савеце. Неаднаразова праводзіліся адкрытыя вучэбныя заняткі з дэманстрацыяй сістэмы выкарыстання практыка-арыентаваных заданняў па фарміраванні чытацкай адукаванасці.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Национальный образовательный портал: [Сайт]. – Мн., 2003-2025. – URL: https://adu.by (дата обращения: 05.12.2025).

2. Национальный образовательный портал: [Сайт] / Особенности диагностического инструментария НИКО (читательская грамотность). – URL:

https://adu.by/images/2023/11/diagn-instrum-chit-gramotn.pdf (Дата обращения: 12.12.2025).

3. Русецкий, В.Ф. Формирование функциональной грамотности как научная и образовательная проблема / В.Ф.Русецкий, О.В.Зеленко // Веснік адукацыі. – 2020.– № 11. – С. 5–13.

4. Формирование и оценка функциональной грамотности обучающихся: подготовка к национальному исследованию качества образования / Горбунова М.Б., Короткевич В.И. // Веснік адукацыі. – 2023. – № 9. – С. 10.

Дадатак 1

**Тэма:** Лады дзеяслова (абвесны, умоўны, загадны)

**Мэта:** стварыць умовы для фарміравання паняцця пра лады дзеяслова

**Задачы:** выпрацоўваць уменні вызначаць лад дзеяслова,

вучыць правільна ўжываць формы ладу дзеясловаў у маўленні;

развіваць мысленне, памяць, мову вучняў;

спрыяць выхаванню патрыятычных пачуццяў да Радзімы.

**Тып урока:** урок камбінаванай будовы

**Абсталяванне**: Валочка Г.М.Беларуская мова: вучэбн. дапам. для 7 класа ўстаноў агул. сярэдн. адукацыі з бел. і рус. мовамі навучання / Мінск: Нац.Ін-т адукацыі, 2020; табліцы, раздатачны матэрыял, сігнальныя карткі.

**Ход урока**

І ў радасці, і ў скрусе
Гарніце ў сэрцы словы,
Расціце бларусамі,
Расціце беларускамі.
Рыгор Барадулін

**I. Матывацыйна-арганізацыйны**

1. Арганізацыйна-псіхалагічная падрыхтоўка навучэнцаў да работы.

– Добры дзень! Вось і зноў мы сустрэліся з вамі, каб працягваць разам крочыць па краіне ведаў, рабіць вялікія і малыя адкрыцці для сябе, папаўняць свой навуковы багаж.

2. Праверка дамашняга задання

§14, практыкаванне 80

Адзін вучань чытае тэкст, вызначае яго тып (апавяданне), называе часткі, якія адпавядаюць кампазіцыйнай схеме тэксту. Другі вучань называе прапушчаныя літары (вечАр, двАры, бацЬка, восЕнь, пасЯліліся, вЕраб’і, сЯдзеў, спрабАваў, вылеЗці, падахвочвалі, вылЯцеў, уСкудлачаны, аБтросся, гАлоўкай), тлумачыць правапіс суфіксаў дзеясловаў. Трэці вучань тлумачыць

значэнне трох фразеалагізмаў, называе той, які перадае асноўную думку тэксту. (Правільны адказ: Не руш чужога і не бойся нікога).

Індывідуальнае заданне “Чацвёрты лішні” для некалькіх вучняў.

У кожным радку падкрэслі лішні дзеяслоў:

а. Абрадаваць, даследваць, пакутаваць, пабудаваць.
б. Фарміраваць, шанаваць, атрымліваць, пакутваць.
в. Адгаварываць загоіваць праветрываць высвістваць.
г. Абкош..ць, затрымл..ць, устанаўл..ць, абпаль..ць.
3. Паведамленне тэмы і задач на ўрок

– Сёння на ўроку мы пазнаёмімся яшчэ з адной граматычнай катэгорыяй дзеяслова. А вось што гэта за катэгорыя, вы зараз здагадаецеся, калі адкажаце на пытанні:

– Падумайце, як гавораць, калі ў доме парадак і згода, усе справы ладзяцца? (Лад)

– Якім словам у музычнай грамаце характарызуецца настрой музыкі (сумны ці вясёлы). (Лад)

Так, гэта слова – ЛАД. У граматыцы таксама прысутнічае гэтае слова.

– Звярніце ўвагу на тэму ўрока, якая запісана на дошцы. (Вучні звяртаюцца да тэмы ўрока, фармулююць разам з настаўнікам задачы на ўрок. Прыём “Працягні фразу”).

Разам з настаўнікам вучні вызначаюць задачы ўрока:

буду ведаць граматычнае значэнне ладоў дзеяслова;

буду ўмець знаходзіць у тэкстах дзеясловы абвеснага, умоўнага, загаднага ладоў;

буду ўмець утвараць і ўжываць у вусным і пісьмовым маўленні дзеясловы абвеснага, загаднага і ўмоўнага ладоў.

**II. Пазнавальна-аперацыйны**

1. Тлумачэнне новага матэрыялу. Праца з правілам (старонка 51 – 53), запаўненне табліцы на індывідуальных картках. Індывідуальнае заданне для аднаго вучня: скласці вуснае выказванне, абапіраючыся на матэрыял табліцы.

| | | |
|---|---|---|
| **Дзеясловы абвеснага ладу** | | |
| Абазначаюць | | |
| Маюць | | |
| Змяняюцца | у цяп. і буд. часе | у прошл. часе |
| **Дзеясловы умоўнага ладу** | | |
| Абазначаюць | | |
| Утвараюцца | дзеяслоў _____і часціца ______ (пасля_______________)<br>дзеяслоў ___________ і часціца _____(пасля_______________) | |
| Змяняюцца | | |
| **Дзеясловы загаднага ладу** | | |
| Выражаюць | | |
| Маюць формы | | |
| Утвараюцца | 2 асоба адз. ліку<br>пры дапамозе _______________ | |
| | 2 асоба множн. ліку:<br>пры дапамозе _________________________ | |

2. Работа з тэкстам па выяўленні дзеясловаў пэўнага ладу (Раздатачны матэрыял).

Вучні чытаюць сказы, вызначаюць лады ў дзеясловаў. Далей праца па варыянтах: 1 варыянт выпісвае дзеясловы ўмоўнага ладу, другі – абвеснага, трэці – загаднага.

Сябры, калі б вы мелі магчымасць часта “жыць на колах”, шмат хадзілі б і падарожнічалі, вы б убачылі многае ў свеце. Але перш за ўсё пазнайце свой край. Збірайцеся і едзьце з экскурсіямі або проста да сваякоў і сяброў. І вы ўбачыце ўсе канцы нашай мілай, ласкавай краіны, якая зачаруе вас сваёй няўлоўнай прыгажосцю. Слухайце музыку нашай пявучай мовы, нашы пяшчотныя песні, і тады вы пазнаеце свой гасцінны, добры і таленавіты народ, пачуеце дыханне сваёй роднай зямлі.

**Фізкультхвілінка**

– Калі вы пачуеце дзеяслоў загаднага ладу – прысядзьце, калі ўмоўнага – падыміце рукі ўверх, абвеснага – павярніцеся да суседа. (напісала б, чытаю, прачытаў бы, стойце, пішаш, глядзіце, паехалі б, слухае, гуляем, бягуць пагулялі б, бі, сказаў бы)

**III. Дыягнастычна-карэкцыйны**

1. Заданне "Лаві памылку"

Вучням неабходна знайсці памылку ва ўтвораных формах дзеяслова і выправіць іх (словы запісаны на дошцы).

| Абвесны | Умоўны | Загадны |
|---|---|---|
| Падарыла | падарыла б | падарылі |
| Пачуеш | пачуй | пачуў бы |
| Зразумееш | зразумеў бы | зразумей |
| Будуць вяртацца | вярталіся б | вяртайся |
| Не знойдзеш | не знайшоў | не знайду |

2. "Тэкст з белымі плямамі" Падарожжа па Мазыры

Вучням неабходна ўставіць дзеясловы патрэбнага ладу

Падарожжа па Мазыры

Раніцай я ўстаў і__________: "Чаму б не правесці маім сябрам экскурсію па Мазыры!" Я пакажу ім найпрыгажэйшыя куткі горада, __________са мной.

Спачатку адправімся да набярэжнай Прыпяці: там можна_________, як плыве рака, і паслухаць шэпт вятроў у дрэвах. Хай кожны ________ спакой і гармонію гэтага месца. Мы _______ толькі па самым галоўным славутасцям горада, а колькі яшчэ тамніц ён змяшчае.

Калі б я ________ больш часу, я _________па ўсіх вуліцах і аглянуў кожны старажытны будынак. Але нават за адзін дзень Мазыр _________ сваёй гісторыяй і прыгажосцю.

Вечарам я вярнуўся дадому з поўны добрых уражанняў. Я ведаю, што яшчэ не адзін раз мае сябры вернуцца сюды. І вы, калі прыедзеце ў Мазыр, ________ для сябе яго таямніцы!

Словы для даведкі: адкрыць, прагуляцца, пайсці, мець, прайсці, зачароўваць, вырашыць, адчуць, паглядзець.

3. Работа з эпіграфам.

І ў радасці, і ў скрусе
Гарніце ў сэрцы словы,
Расціце беларусамі,
Расціце беларускамі.

Рыгор Барадулін

1. Прачытайце эпіграф, вызначце яго асноўную думку.
2. Знайдзіце дзеясловы, якога яны ладу?
3. З якім заклікам звяртаецца да нас паэт?
4. Які будзе наш адказ Рыгору Барадуліну?

4. Падвядзенне вынікаў урока

"Міф ці праўда"

Вучні ўважліва слухаюць сцвярджэнні і падымаюць сігнальныя карткі: зялёны колер – "праўда", калі згодны, чырвоны –"міф".

– Дзеясловы абвеснага ладу ўтвараюцца пры дапамозе часціц бы, б.

– Дзеясловы абвеснага ладу не ўтвараюць часавых пар.

– Дзеясловы загаднага ладу абазначаюць пабуджэнне да дзеяння, загад, просьбу, пажаданне.

– Дзеясловы абвеснага ладу змяняюцца па ліках.

– Дзеясловы загаднага ладу ў множным ліку маюць нулявы канчатак.

– Дзеясловы абвеснага ладу абазначаюць дзеянні, якія сапраўды адбываліся, адбываюцца ці будуць адбывацца.

– Дзеясловы загаднага ладу звычайна маюць формы 2-й асобы адзіночнага і множнага ліку.

– Дзеясловы ўмоўнага ладу змяняюцца па ліках і родах (у адзіночным ліку).

– Вернемся да задач, якія мы разам ставілі на пачатку ўрока. Вызначце кожны самастойна, ці выканалі вы ўсе задачы.

**IV. Завяршальны**

1. Выстаўленне і каменцірванне адзнак.
2. Паведамленне і запіс дамашняга задання.

§15, заданне “Складанне інструкцыі”. Вучні павінны скласці інструкцыю, ужываючы дзеясловы загаднага ладу “Пешае падарожжа па горадзе”.

Дадатак 2

Індывідуальнае заданне “Чацвёрты лішні” для некалькіх вучняў.

У кожным радку падкрэслі лішні дзеяслоў:

а. Абрадаваць, даследваць, пакутаваць, пабудаваць.

б. Фарміраваць, шанаваць, атрымліваць, пакутваць.

в. Адгаварываць загоіваць праветрываць высвістваць.

г. Абкош..ць, затрымл..ць, устанаўл..ць, абпаль..ць.

Дадатак 3

| **Дзеясловы абвеснага ладу** | | |
|---|---|---|
| Абазначаюць | | |
| Маюць | | |
| Змяняюцца | у цяп. і буд. часе | у прошл. часе |
| **Дзеясловы умоўнага ладу** | | |
| Абазначаюць | | |
| Утвараюцца | дзеяслоў _____і часціца ______ (пасля_______________)<br>дзеяслоў ___________ і часціца _____(пасля______________) | |

| | |
|---|---|
| Змяняюцца | |
| **Дзеясловы загаднага ладу** | |
| Выражаюць | |
| Маюць формы | |
| Утвараюцца | 2 асоба адз. ліку<br>пры дапамозе ______________ |
| | 2 асоба множн. ліку:<br>пры дапамозе _______________________ |

Дадатак 4

Праца варыянтах: 1 варыянт выпісвае дзеясловы ўмоўнага ладу, другі – абвеснага, трэці – загаднага.

Сябры, калі б вы мелі магчымасць часта “жыць на колах”, шмат хадзілі б і падарожнічалі, вы б убачылі многае ў свеце. Але перш за ўсё пазнайце свой край. Збірайцеся і едзьце з экскурсіямі або проста да сваякоў і сяброў. І вы ўбачыце ўсе канцы нашай мілай, ласкавай краіны, якая зачаруе вас сваёй няўлоўнай прыгажосцю. Слухайце музыку нашай пявучай мовы, нашы пяшчотныя песні, і тады вы пазнаеце свой гасцінны, добры і таленавіты народ, пачуеце дыханне сваёй роднай зямлі.

Дадатак 5

Падарожжа па Мазыры

Раніцай я ўстаў і__________: “Чаму б не правесці маім сябрам экскурсію па Мазыры!” Я пакажу ім найпрыгажэйшыя куткі горада, ___________са мной.

Спачатку адправімся да набярэжнай Прыпяці: там можна_________, як плыве рака, і паслухаць шэпт вятроў у дрэвах. Хай кожны ________ спакой і гармонію гэтага месца. Мы _______ толькі па самым галоўным славутасцям горада, а колькі яшчэ тамніц ён змяшчае.

Калі б я ________ больш часу, я _________па ўсіх вуліцах і аглянуў кожны старажытны будынак. Але нават за адзін дзень Мазыр _________ сваёй гісторыяй і прыгажосцю.

Вечарам я вярнуўся дадому з поўны добрых уражанняў. Я ведаю, што яшчэ не адзін раз мае сябры вернуцца сюды.

І вы, калі прыедзеце ў Мазыр, ________ для сябе яго таямніцы!

Словы для даведкі: адкрыць, прагуляцца, пайсці, мець, прайсці, зачароўваць, вырашыць, адчуць, паглядзець.

Дадатак 6

Узровень чытацкай адукаванасці на працягу 2021-2026 гадоў

